В. Х. СЕРАДЗІНСКАЯ

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ 3

Частка 2



# Разнастайнасць жывёл

## Насякомыя



## Рыбы



## Жабы і рапухі



## Яшчаркі і змеі



## Птушкі



## Звяры



# Рэжым дня



7:10



7:20



7:35



9:00



13:00



13:30



15:00



16:30



19:00



19:30



20:30



21:30

# Чалавек-працаўнік







# Вырабы

## Мэбля



## Посуд



## Цацкі



## Транспарт



## Адзенне



## Абутак



## Галаўныя ўборы



## Інструменты



В. Х. Серадзінская

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў
з беларускай мовай навучання і выхавання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2022

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 502(075.2=161.3)-056.313
ББК 74.3
С32

Рэцэнзенты:

кафедра педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. Г. Сарока*);
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Вілейская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат» *А. В. Буцько*

## Умоўныя абазначэнні

— пытанні і заданні перад чытаннем тэксту;

— новыя словы. Чытаем іх па складах і цалкам. Прагаворваем услых і пра сябе. Удакладняем значэнне. Складаем словазлучэнні і сказы;

— работа ў парах (моўныя і лагічныя практыкаванні);

— работа ў групах (вопыты, назіранні, практычныя заданні);

— пытанні і заданні для паўтарэння і замацавання. Больш складаныя пытанні і заданні пазначаны зорачкай (*);

— заданні для пазаўрочнай работы;

— дадатковы матэрыял. Яго неабавязкова вывучаць усім вучням. Гэта тэксты для дапытлівых.

Памятайце, што пасля вас вучэбным дапаможнікам будуць карыстацца іншыя вучні. Беражыце яго.

ISBN 978-985-893-250-3 (ч. 2)
ISBN 978-985-893-248-0

© Серадзінская В. Х., 2022
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2022

Правообладатель Национальный институт образования

Змест

## ЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК
(працяг)

**Жывёлы — частка жывой прыроды** ....... 5
Разнастайнасць жывёл ........................ 5
Насякомыя .................................. 8
Рыбы ....................................... 10
Жабы і рапухі .............................. 12
Яшчаркі, змеі, чарапахі .................... 15
Птушкі ..................................... 19
Звяры ...................................... 23
Расліннаедныя звяры ........................ 27
Драпежныя звяры ............................ 29
Усёедныя звяры ............................. 32
У прыродзе ўсе важныя, усе патрэбныя .... 35
Свойская жывёла ............................ 37
Небяспечныя жывёлы: каго баяцца ........ 40
*Пагаворым пра жывёл. Разважайце, расказвайце* ..................................... 44

**Чалавек — частка жывой прыроды** ....... 46
Клопат пра здароўе і бяспеку ................ 46
Рэжым дня .................................. 49
Харчаванне і здароўе ....................... 52
Зубы, іх догляд ............................ 54
Як папярэдзіць хваробы .................... 57
Хто такія паразіты ......................... 60



Правообладатель Национальный институт образования

Чым карысны адпачынак на прыродзе.
Чаго баяцца .................................. 63
*Пагаворым пра здароўе і бяспеку. Разважайце, расказвайце* .............................. 67

## ЧАЛАВЕК — ЧАСТКА ГРАМАДСТВА

**Чалавек-працаўнік. Правілы паводзін у грамадскіх месцах** ............................ 68
На будоўлі ...................................... 68
Праца гараджан на фабрыках і заводах ... 72
Праца сельскіх жыхароў на палях ........ 75
Хто такія жывёлаводы ........................ 80
Магазіны. Дзе і што мы купляем .......... 83
Дзе можна адпачыць у выхадны дзень .... 86
У бібліятэцы ..................................... 89
Мы — пасажыры .............................. 92
У паліклініцы, бальніцы ..................... 95
На пошце ....................................... 97
Дзе і што мы ядзім ............................ 100
Служба быту .................................... 103
*Пагаворым пра чалавека-працаўніка. Разважайце, расказвайце* .................106
**Хатняя і школьная эканоміка** ............. 107
Што такое эканоміка .......................... 107
Эканоміка сям'і ................................. 110
Школьная эканоміка .......................... 113
**Правы дзіцяці** ................................. 115
Што такое правы чалавека ................... 115
*Пагаворым пра эканоміку і правы дзіцяці. Разважайце, расказвайце* .................118



Правообладатель Национальный институт образования



# ЖЫВАЯ ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (працяг)

## ЖЫВЁЛЫ — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ

### Разнастайнасць жывёл

Разгледзьце малюнак-схему на форзацы 1. Пакажыце на малюнку звера, птушку, насякомае, рыбу. Назавіце вядомых вам звяроў (птушак, насякомых, рыб). Пакажыце на малюнку жабу (яшчарку). Ці даводзілася вам бачыць іх у прыродзе? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны.

Органы пачуццяў, нюх, расліннаедныя, драпежныя, усёедныя.

Вавёрка, матылёк, шчупак, жаба, яшчарка, верабей — гэта жывёлы. Яны адрозніваюцца адно ад аднаго знешнім выглядам, памерамі. Напрыклад, скура жывёл пакрыта неаднолькава.



Правообладатель Национальный институт образования

У кагосьці ёсць шэрсць, у кагосьці — пер’е або луска, а ў кагосьці скура голая. Жывёлы насяляюць сушу, глебу, ваду. З улікам падобных прымет іх падзяляюць на групы. Кожная група мае сваю назву. Гэта вядомыя вам насякомыя, рыбы, птушкі і звяры. Пра іншыя групы жывёл вы даведаецеся на наступных уроках.

У адных жывёл ёсць свой прыродны дом: лес, рака, балота або луг. Яны самі здабываюць сабе корм, самі будуюць жыллё. Такіх жывёл называюць дзікімі. Кароў, свіней, курэй разводзяць людзі. Гэта свойская жывёла. Яна не можа жыць без дапамогі чалавека.

Жывёлы перамяшчаюцца. Яны бегаюць, плаваюць, лятаюць, поўзаюць. Ім неабходны корм для харчавання, паветра для дыхання, вада для піцця. Жывёлам патрэбна цяпло, каб не замерзнуць. У дарослых жывёл нараджаюцца дзіцяняты. Самыя старыя жывёлы калі-небудзь паміраюць.

Усё гэта азначае, што жывёлы — частка жывой прыроды. У іх ёсць **органы пачуццяў:** зрок, слых, **нюх** і іншыя. Гэта дапамагае жывёлам знаходзіць ежу, адчуваць небяспеку.

Жывёлы не могуць ствараць для сябе ежу самі. Яны ядуць расліны або іншых жывёл. Ласі, зайцы, каровы, козы кормяцца травой,


Правообладатель Национальный институт образования

галінамі дрэў і кустоў. Такіх жывёл называюць **рас-лін-на-ед-ны-мі**. Назва «раслiннаедныя» ўзнікла ад слоў «расліны паядаць». Ваўкі, лісіцы, совы, шчупакі палююць на іншых жывёл. Яны — **драпежныя**. Бурыя мядзведзі, дзікі, вароны ядуць расліны і іншых жывёл. Іх называюць **у-сё-ед-ны-мі**. Назва «ўсёедныя» пайшла ад слоў «усё паядаць».

1. Якой групе жывёл адпавядаюць прыметы?

Не могуць абыходзіцца без дапамогі людзей.
Самі здабываюць сабе ежу.

2. Свойская або дзікая? Падбярыце жывёле пару.

Заяц, ... . Сабака, ... .

3. На якія дзве групы можна падзяліць гэтых жывёл?

Лісіца, кошка, воўк, карова, вавёрка, свіння.

1. Назавіце вядомых вам жывёл. Дзе іх можна ўбачыць?
2. Чаму жывёл адносяць да жывой прыроды?
3*. Чым жывёлы адрозніваюцца адна ад адной?
4*. Прачытайце схему. Прывядзіце прыклады жывёл з кожнай групы.



Правообладатель Национальный институт образования

Жывёлы

раслінаедныя | драпежныя | усёедныя

Наведайце школьны куток прыроды (па магчымасці). Падаглядайце жывёл. Падрыхтуйце паведамленне пра адну з іх.

## Насякомыя

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце ўсіх агульным словам. Што вы ведаеце пра насякомых? Якіх насякомых вы бачылі ў прыродзе?

Галава, грудзі, брушка, насечкі.

Матылёк, жук, пчала, мурашка, муха — насякомыя. Іх можна сустрэць у лесе, полі, агародзе, садзе, на лузе. Яны жывуць на зямлі, у глебе, вадзе, паветры. Адны з іх яркія, другія — непрыметныя. Усе насякомыя маюць падобныя прыметы. Іх цела складаецца з **галавы,**



*Матылёк* *Жук* *Пчала* *Мурашка* *Муха*



Правообладатель Национальный институт образования

**грудзей, брушка**. У кожнага насякомага 6 ног. У многіх ёсць крылы. На брушку відаць тонкія рыскі — **насечкі**. Адсюль і назва — «насякомыя».

Насякомыя перамяшчаюцца па-рознаму. Яны скачуць, поўзаюць, лятаюць, плаваюць, бегаюць.

Насякомыя кормяцца рознай ежай. Прачытайце і вызначце, хто з іх расліннаедны (драпежны, усёедны).

Матылькі, пчолы здабываюць з кветак салодкі нектар. Тля смокча сок раслін. Божыя кароўкі паядаюць тлю. Стракозы ловяць мух, камароў. Мурашкі харчуюцца сакавітымі часткамі раслін, дробнымі жукамі, вусенямі.

Насякомыя адыгрываюць вялікую ролю ў прыродзе. Шмат якія з іх апыляюць кветкі. Без апылення не бывае пладоў. Мурашкі знішча-юць лясных шкоднікаў. Божыя кароўкі дапамагаюць захаваць ураджай на палях, у агародах, садах. Большасць насякомых упрыгожваюць прыроду. Імі кормяцца жабы, шматлікія рыбы, птушкі.

1. Разгледзьце малюнкі на старонцы 8. Выберыце выявы насякомых. Якое падабенства ёсць ва ўсіх насякомых? З апорай на малюнак назавіце часткі цела насякомага. Пакажыце галаву (грудзі, брушка, крылы, ногі).



Правообладатель Национальный институт образования

2. Прадоўжыце пералік.

Насякомыя — гэта жукі, ... .

1. Дзе ў прыродзе можна сустрэць насякомых?
2. Назавіце вядомых вам насякомых.
3*. Чым насякомыя адрозніваюцца ад іншых жывёл?
4*. Што ядуць насякомыя? Прачытайце ў тэксце. Перакажыце.

Падчас прагулак паназірайце за насякомымі ў прыродзе. Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Падрыхтуйце паведамленне «Цікавыя факты пра насякомых».

## Рыбы

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны. Што вы ведаеце пра рыб?

Плаўнік, луска, жабры, ікра.

Карась, таўсталобік, акунь, шчупак — гэта рыбы. Яны ўвесь час жывуць у вадзе. Без вады рыбы хутка гінуць. Ва ўсіх рыб ёсць падабенства. Іх целы складаюцца з галавы, тулава і хваста. На целе ёсць **плаўнікі**. Яны дапамагаюць рыбе плаваць. Скура рыб пакрыта **луской**. На галаве ў іх размяшчаюцца вочы, рот.



Правообладатель Национальный институт образования



*Карась*



*Таўсталобік*



*Шчупак*



*Акунь*

Па баках рота знаходзяцца **жабры**. Рот у рыбы ўвесь час адкрываецца і закрываецца. Яна набірае ў яго ваду і прапускае праз жабры. Так рыба дыхае. Рыбы адкладваюць у ваду **ікру**. З ікрынак развіваюцца малькі.

У рэках і азёрах Беларусі водзяцца раслінаедныя, драпежныя, усёедныя рыбы. Таўсталобік — раслінаедны. Ён корміцца водарасцямі. Гэту рыбу спецыяльна запускаюць у вадаёмы, каб ачысціць іх ад водарасцей. Шчупак, акунь харчуюцца дробнымі рыбкамі, смаўжамі, жабянятамі. Гэта драпежныя рыбы. Карась паядае часткі водных раслін, чарвякоў, насякомых. Ён усёедны.

1. Разгледзьце прапанаваныя настаўнікам малюнкі. Выберыце выявы рыб. Якое падабенства ёсць у іх? З апорай на малюнак назавіце часткі цела рыбы. Пакажыце галаву (тулава, хвост, плаўнікі, жабры).



Правообладатель Национальный институт образования

2. Падбярыце роднасныя словы.

Рыба — рыбка, ..., ... .

Мяса рыб смачнае і карыснае. Таму людзі ловяць іх у вадаёмах або купляюць у магазінах. Рыбы з'яўляюцца ежай для іншых водных і каляводных жывёл. Іх жыццё ў рэках і азёрах залежыць ад чысціні вады. Таму вадаёмы трэба берагчы ад забруджвання.

1. Прывядзіце прыклады рыб. Для адказу выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 11.

2. З якіх частак складаецца цела рыбы?

3*. Чым рыбы адрозніваюцца ад іншых жывёл?

4*. На якія групы падзяляюць рыб па спосабе харчавання? Прывядзіце прыклады з кожнай групы.

Station: Паназірайце за рыбкамі ў акварыуме (па магчымасці). Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Як кормяцца? Дапамагайце дарослым даглядаць рыбак. Падрыхтуйце паведамленне пра адну з іх.

## Жабы і рапухі

Дзеці ішлі па беразе сажалкі. У траве скакалі жабы. Пачуўшы крокі дзяцей, яны ныралі ў ваду. Дзе жывуць жабы: на сушы або ў вадзе?

Ноздры, перапонка, апалонік, земнаводныя.



Правообладатель Национальный институт образования



*Жаба*



*Апалонік*



*Рапуха*

***Жабы*** жывуць па берагах рэк, азёр, сажалак. Іх цела складаецца з галавы, тулава і чатырох ног. У жабы няма шыі. Таму яна не можа паварочваць галаву ў бакі. На галаве размешчаны вочы, **ноздры**, шырокі рот. Скура голая, гладкая, слізкая. Заднія ногі ў жабы даўжэйшыя і мацнейшыя за пярэднія. Паміж пальцамі задніх ног ёсць **перапонкі**. Яны дапамагаюць жабе плаваць.

Афарбоўка цела жаб зліваецца з колерам зялёных раслін. Гэта робіць іх непрыметнымі сярод травы.

Жабы ядуць насякомых і іх лічынак. Яны шукаюць корм у вадзе, на сушы, хапаюць яго з раслін, ловяць на ляту. Жабы хутка скачуць, калі бачаць насякомае. Пры гэтым выкідваюць з рота доўгі ліпкі язык. Утрымліваць здабычу ім дапамагаюць зубы. Жаб паядаюць драпежныя рыбы, птушкі.

***Рапуха*** адрозніваецца ад жабы. Яна тоўстая, непаваротлівая. Скура ў рапухі гу-за-ва-та-я. Заднія ногі яе карацей, чым у жабы. Рапуха



Правообладатель Национальный институт образования

перамяшчаецца, павольна перaступаючы нагамі. Скакаць яна не любіць. Рапухі жывуць у сырых месцах. Насяляюць сады, агароды. Харчуюцца слізнякамі, вусенямі, мухамі. Знішчаючы вялікую колькасць шкоднікаў, яны дапамагаюць зберагчы ўраджай.

Некаторыя людзі не любяць жаб і рапух. Кажуць, што яны непрыгожыя. Жабы, рапухі — без-а-ба-рон-ны-я карысныя жывёлы. Яны маюць патрэбу ў ахове. Абараняйце іх! Сяброў жа выбіраюць не па прыгажосці.

Вясной жабы і рапухі адкладваюць у ваду ікру. З ікры з'яўляюцца **апалонікі**. Яны хутка растуць, развіваюцца. Праз некаторы час апалонікі ператвараюцца ў маленькіх жабак і рапух. Яны выпаўзаюць з вады на сушу і могуць жыць тут. Жабы, рапухі адносяцца да **земнаводных**. Частку жыцця яны праводзяць на сушы (гэта значыць на зямлі), а частку — у вадзе. За гэта яны і атрымалі сваю назву.

1. Разгледзьце малюнкі на старонцы 13. Якое падабенства ёсць у жабы і рапухі? У чым іх адрозненне? З апорай на малюнак назавіце часткі цела жабы (рапухі). Пакажыце галаву, тулава, ногі. Як вы ставіцеся да жаб і рапух? Чаму так?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Як перамяшчаюцца жаба і рапуха? Выкарыстоўваючы пытанні і апорныя словы, складзіце сказы.

**Х т о?** Жаба, рапуха.

**Ш т о р о б і ц ь?** Скача, пераступае, плавае, нырае.

**Я к?** Хутка, павольна.

1. З якіх частак складаецца цела жабы?

2. Дзе можна сустрэць жаб? Рапух?

3*. Як земнаводныя перамяшчаюцца па зямлі? У вадзе?

4*. Растлумачце, чаму жаб і рапух адносяць да земнаводных.

Вясной паназірайце за апалонікамі (па магчымасці). Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Даведайцеся, у чым асаблівасць языка жабы.

## Яшчаркі, змеі, чарапахі

Хлопчык схапіў яшчарку. Ён хацеў яе разгледзець. Яшчарка вырвалася і схавалася ў траве. У руках у хлопчыка застаўся яе хвост. Хлопчык разгубіўся. Ён не хацеў адрываць хвост яшчарцы. Што здарылася?

Панцыр, паўзуны.

***Яшчарка.*** У целе яшчаркі вылучаюць галаву, шыю, тулава, хвост і чатыры нагі. Тулава ў яе прадаўгаватае, хвост доўгі. Дзякуючы шыі галава



Правообладатель Национальный институт образования



*Чарапаха*



*Гадзюка*



*Вуж*



*Яшчарка*

яшчаркі паварочваецца ў бакі. Афарбоўка цела робіць яе непрыметнай сярод травы. Яшчарка хутка бегае. Калі схапіць яе за хвост, то яна адкідае яго. Гэта ж лепш, чым загінуць самой. Праз некаторы час хвост адрастае нанава. Яшчарка харчуецца насякомымі, іх лічынкамі, чарвякамі.

***Змеі***. Вуж, гадзюка — змеі. Іх цела выцягнутае. Галава, тулава і хвост пераходзяць адно ў адно без рэзкіх меж. Ног у змей няма. Яны поўзаюць, выгінаючы сваё цела. Змеі ўмеюць плаваць. Яны палююць на мышэй, птушак, яшчарак, рыб, жаб. Здабычу заглытваюць цалкам, нярэдка жыўцом. Змеі — драпежнікі.

***Вуж*** — неядавітая змяя. У яго звычайна цёмная спіна. Па баках галавы ёсць дзве аран-



Правообладатель Национальный институт образования

жава-жоўтыя плямы. Па гэтай прымеце вужа лёгка адрозніць ад іншых змей.

***Гадзюка*** — небяспечная ядавітая змяя. Гадзюкі бываюць шэрага, карычневага, чорнага колераў. Уздоўж спіны ў іх ёсць хвалісты ўзор. Па гэтым узоры і адрозніваюць гадзюку ад іншых змей. Яд гадзюкі можа быць смяротным для чалавека. Пры ўкусе трэба неадкладна звярнуцца да ўрача.

***Чарапахі***. Галоўная асаблівасць чарапах — моцны **панцыр** на тулаве. Галава, шыя і ногі панцырам не пакрыты. Яны высоўваюцца з яго адтулін і ўцягваюцца назад. Так чарапахі абараняюцца ад нападу.

У нашай краіне на балотах, у сажалках, азёрах жыве балотная чарапаха. Па сушы яна перамяшчаецца марудна, затое добра плавае і нырае. Чарапаха харчуецца толькі ў вадзе. Ловіць смаўжоў, чарвякоў, насякомых. Таксама яна есць мяккія часткі водных раслін. Балотная чарапаха — усёедная жывёла. Яна занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Яшчаркі, змеі, чарапахі — наземныя жывёлы. Падчас руху іх цела змыкаецца, датыкаецца да паверхні зямлі. Гэту групу жывёл назвалі **паў-зу-на-мі**. Убачыць паўзуноў у прыродзе можна не заўсёды. Назіраць за імі добра ў заапарку.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Правядзіце гульню «Так або не». Выберыце вядучага. У яго ў руках закрытая карцінка. Каб даведацца, хто на ёй намаляваны, задавайце пытанні. Распытваць трэба так, каб вядучы мог адказваць толькі словамі «так» або «не». Адказы запісвайце на дошцы. Пытанні задавайце да той пары, пакуль карцінка не будзе названа. Пачаць можна так: *«Гэта жывёла? Яна свойская? Гэта птушка?»* і г. д.

З апорай на адкрытую карцінку і запісаныя адказы складзіце паведамленне пра жывёлу.

2. Чым вуж і гадзюка падобны адно на аднаго? Чым адрозніваюцца? Як у прыродзе распазнаць вужа? Гадзюку?

1. З апорай на малюнкі на старонцы 16 раскажыце пра будову цела яшчаркі (змяі).

2. Чым харчуецца яшчарка (вуж, гадзюка)?

3*. Прачытайце схему. Раскажыце пра змей. Якіх змей трэба асцерагацца? Чаму?

Змеі

ядавітыя | неядавітыя

4*. Да якой групы жывёл адносяцца яшчаркі, змеі, чарапахі? Чаму гэту групу жывёл так называюць?

Пазнаёмцеся з Чырвонай кнігай Рэспублікі Беларусь (частка 2). Разгледзьце малюнкі, прачытайце


Правообладатель Национальный институт образования

назвы жывёл, якіх трэба ахоўваць. Падрыхтуйце паведамленне «Жывёлы з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь».

## Птушкі

! Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце агульным словам усіх, хто намаляваны. Што вы ведаеце пра птушак? Якіх птушак вы бачылі ў прыродзе?

Пер’е, дзюба, гняздо, кіпцюры.

Ластаўка, шпак, бусел, верабей, сініца — гэта птушкі. Іх скура пакрыта **пер’ем**. Пер’е захоўвае цяпло, засцерагае ад холаду. У птушак ёсць галава, шыя, тулава і дзве пары канечнасцей (2 нагі і 2 крылы). На галаве ў іх размешчаны вочы. У птушак няма зубоў,



*Ластаўка*



*Шпак*



*Бусел*



*Верабей*



*Сініца*



Правообладатель Национальный институт образования

затое ёсць **дзюба**. Яны дзяўбуць ёю корм, ствалы дрэў, скубуць траву. З дапамогай дзюбы птушкі будуюць **гняздо**, кормяць птушанят, абараняюцца. Яе форма і даўжыня залежаць ад спосабу харчавання. Напрыклад, драпежныя птушкі маюць моцную дзюбу з загнутым вострым канцом.

Птушыныя ногі прыстасаваны не толькі для хадзьбы. На іх ёсць пальцы з вострымі **кіпцюрамі**. Імі птушкі разгортваюць зямлю, хапаюць здабычу, утрымліваюцца на галінах дрэў. З дапамогай ног качкі, гусі плаваюць па вадзе. Гэта водаплаўныя птушкі.

Шмат якія птушкі ўмеюць лятаць. У гэтым ім дапамагаюць крылы.

Птушынае пер’е лёгкае, трывалае, мяккае, цёплае. Людзі кажуць, што пасцель у птушкі заўсёды з сабой. Пер’е на брушку — пярынка. Пер’е на спінцы — коўдра. З такой пасцеллю можна спаць усюды, нават на вадзе. Так робяць гусі, качкі, лебедзі.

Птушкі голасам падаюць адна адной розныя сігналы. Вароны каркаюць. Жураўы курлыкаюць. Галубы буркуюць. Сініцы свішчуць. Вераб’і цвыркаюць. Нехта шчабеча, нехта гагоча.

Птушкі робяць гнёзды. Яны іх лепяць, плятуць, складваюць, падвешваюць. У іх адкладваюць яйцы, выседжваюць птушанят.



Правообладатель Национальный институт образования

***Памятайце!*** Нельга трывожыць птушку, якая сядзіць у гняздзе. Калі птушка пакіне яго, то яйцы астынуць. Птушаняты з іх не выведуцца.

Птушкі ядуць розную ежу. Прачытайце і вызначце, хто з іх расліннаедны (драпежны, усёедны).

Асноўным кормам голуба, снегіра з'яўляюцца плады і насенне раслін. Сава, ястраб ловяць мышэй, зайчанят, яшчарак, дробных птушак. Варона, грак ядуць зялёныя часткі раслін, ягады, насякомых, чарвякоў.

Ластаўкі, шпакі, буслы зімой не знаходзяць сабе корму. Таму яны адлятаюць у цёплыя краі. Гэта пералётныя птушкі. Вераб'і, вароны, сініцы застаюцца зімаваць. Іх называюць зімуючымі. Але і гэтыя птушкі могуць загінуць зімой ад голаду. Таму людзі падкормліваюць іх.

Птушкі знішчаюць вялікую колькасць насякомых-шкоднікаў. Яны разносяць плады і насенне раслін. Птушкі ўпрыгожваюць прыроду, радуюць нас сваімі спевамі.

1. Замяніце словазлучэнні іншымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе. Пастаўце да іх пытанні: ч ы й? ч ы ё? ч ы я? ч ы е?



Правообладатель Национальный институт образования

Хвост птушкі — … . Гняздо вароны — … . Галава ластаўкі — … . Пер’е птушкі — … . Яйцо голуба — … .

2. Замест кропак падбярыце словы, якія падыходзяць па сэнсе. Раскажыце, хто кім быў і кім стаў.

Шпачаня — … . Савяня — … . Зязюляня — … . Верабейка — … .

3. Дапоўніце сказы. Якія птушкі так падаю́ць голас? У якіх выпадках так гавораць пра людзей?

Стракоча, як … . Шчабеча, як … . Гагочуць, як … . Буркуюць, як … .

? 1. Назавіце вядомых вам птушак. Для адказу выкарыстоўвайце малюнкі на старонцы 19.

2. Растлумачце, чым птушкі адрозніваюцца ад іншых жывёл.

3*. З апорай на малюнак апішыце знешні выгляд і будову цела адной птушкі (на выбар).

4*. Прачытайце схемы. На якія групы можна падзяліць птушак? З апорай на тэкст прывядзіце прыклады птушак з кожнай групы.





Правообладатель Национальный институт образования

Птушкі

пералётныя | зімуючыя

Разам з дарослымі зрабіце кармушкі для птушак. Паразвешвайце іх каля школы або дома. Арганізуйце птушыную «сталовую». Паназірайце за птушкамі. Як яны выглядаюць? Як перамяшчаюцца? Як кормяцца?

## Звяры

Каго вы бачыце на малюнках? Назавіце ўсіх агульным словам. Што вы ведаеце пра звяроў? Якія іншыя звяры вам вядомы?

Шэрсць, млекакормячыя.



*Вавёрка*



*Мыш*



*Кіт*



*Слон*



*Тыгр*



Правообладатель Национальный институт образования

## Пагаворым пра чалавека-працаўніка. Разважайце, расказвайце

1. Назавіце вядомыя вам прафесіі. Навошта нам так многа прафесій?

2. Хто працуе на будоўлі? У полі? На ферме? У паліклініцы? На транспарце?

3. Што вам вядома аб працы муляра (трактарыста, жывёлавода, урача, кухара)?

4. Раскажыце аб прафесіі сваёй маці ці бацькі.

5. Ці можна сказаць так: «Усе прафесіі патрэбны, усе прафесіі важныя»?

6. Кім вы хочаце быць, калі вырасцеце? Як вы рыхтуецеся да гэтага?

7. Якія грамадскія месцы вы наведваеце? Якія правілы этыкету выконваеце?

8. Падзяліцеся на пары. Правядзіце гульню «Хто што робіць». Адзін называе прафесію. Другі — чым займаецца чалавек гэтай прафесіі (ці наадварот).

# ХАТНЯЯ І ШКОЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

## Што такое эканоміка

Што неабходна чалавеку для жыцця? Прадоўжыце пералік: *вада, паветра, прадукты харчавання, посуд, ...* .

Эканоміка, цана, здача.

Ваду, паветра, сонечнае святло і цяпло людзі атрымліваюць ад прыроды. Акрамя таго, яны маюць патрэбу ў прадуктах харчавання, адзенні, абутку, кнігах і многім іншым (форзац 2). Гэтыя і іншыя тавары людзі купляюць у магазінах, на рынках. Кожны чалавек карыстаецца паслугамі іншых людзей. *(Прыгадайце службу быту на малюнку на старонцы 104.)* Тавары і паслугі мы павінны аплачваць. Бо ў іх укладзена праца іншых людзей, на ўсё патрачаны матэрыялы. Атрымліваецца, чалавек аддае грошы ў абмен на тавары і паслугі. Грошы трэба расходаваць эканомна, па-гаспадарску. Так, каб іх на ўсё хапала. Для гэтага неабходна ведаць правілы вядзення га-спа-дар-кі. Хатнюю гаспадарку мае кожная сям'я. Гэта ўсё тое, што ёй належыць. Правілам вядзення гаспадаркі вучыць **эканоміка**.

Гаспадарка бывае не толькі хатняй. Сваю гаспадарку маюць кожны раён, горад, краіна.



Правообладатель Национальный институт образования

Гэта ўсё, што ім належыць: заводы, фабрыкі, фермы, магазіны, бальніцы, школы, транспарт. Таксама тое, што зроблена рукамі людзей на заводах і фабрыках. Усё гэта звязана паміж сабой і складае эканоміку раёна, горада ці краіны.

Кожны тавар мае сваю **цану**. Пра яе трэба даведацца, перш чым купіць тавар. Адна і тая ж рэч можа быць больш дарагой і больш таннай. Ад чаго залежыць цана тавару?

*Прыклад 1*. Камп'ютар даражэйшы за тэлефон. Чаму? Бо на выраб камп'ютара затрачана больш матэрыялаў і працы. Камп'ютар — больш складаная прылада.

*Прыклад 2*. Батон і торт прыгатавалі з пшанічнай мукі аднаго гатунку. Важаць яны прыкладна аднолькава. Але торт даражэйшы за батон. Чаму? Таму што ў торт дабаўлены прадукты, якіх няма ў батоне. Напрыклад, сметанковае масла, арэхі, шакалад. На афармленне і ўпакоўку торта затрачаны дадатковыя сродкі і намаганні людзей.

*Прыклад 3*. У адной скрыні бананы буйныя, спелыя. У іншай — такія ж буйныя, але счарнелыя, пераспелыя. Доўга захоўвацца яны не будуць. Гэтыя бананы больш танныя. Значыць, цана залежыць і ад якасці тавару.



Правообладатель Национальный институт образования

*Прыклад 4*. Прадаюцца яблыкі — адборныя, румяныя. Адны вырашчаны ў Беларусі, іншыя прывезены з Малдовы. Малдаўскія яблыкі больш дарагія. Чаму? На іх перавозку былі затрачаны грошы.

1. Прыдумайце і разыграйце сітуацыі «Прадавец і пакупнік». Гульнявыя ролі: прадаўцы, пакупнікі.

2. Вы хочаце купіць абутак. Адкажыце на пытанні прадаўца.

Якога памеру (фасону, колеру)? З якога матэрыялу? Па якой цане: дарагія ці танныя? Які абцас (высокі, нізкі, тонкі, тоўсты)?

Прапануйце свае пытанні.

3. Вы хочаце купіць шапачку. Апішыце яе прадаўцу. Выкарыстоўвайце словы: *сіняя*, *у палоску*, *у клетку*, *нияркай расфарбоўкі*, *цёплая*, *тонкая*.

Прыдумайце і разлічыце цану пакупкі і **здачу**.

1. Прывядзіце прыклады тавараў. Прывядзіце прыклады паслуг.

2. Чаму чалавек павінен аплачваць тавары? Паслугі?

3*. Растлумачце, ад чаго залежыць цана тавару? Прывядзіце прыклады.

4*. Чаму трэба эканомна, па-гаспадарску расходаваць грошы?

Папрасіце дарослых паказаць вам беларускія папяровыя грошы і манеты.



Правообладатель Национальный институт образования

## Эканоміка сям'і

Успомніце, што такое сям'я. Раскажыце пра сваю сям'ю. Ці абмяркоўваюць у вашай сям'і, як лепш расходаваць грошы?

Дабрабыт, зберажэнні, даходы, расходы.

Вы ўжо ведаеце, што кожная сям'я мае хатнюю гаспадарку. Ёю звычайна кіруюць дарослыя — бацькі. Прымаць удзел у вядзенні хатняй гаспадаркі павінны ўсе члены сям'і. У кожнага з іх свая роля. Нехта зарабляе грошы, нехта ходзіць у магазін, нехта мые посуд. Хатняя праца не менш важная, чым работа на заводзе ці будоўлі. Ад таго, як вядзецца хатняя гаспадарка, залежыць **да-бра-быт** сям'і.

Каб кіраваць гаспадаркай, трэба ўмець лічыць грошы. А гэта не так проста, як падаецца на першы погляд. Адкуль у сям'ю паступаюць грошы? Як яны расходуюцца? Адказы на гэтыя пытанні вам падкажуць схемы.

*Зарплата таты* →
*Дапамога мамы* →
*Стыпендыя сына* →
*Пенсія дзядулі* →
*Пенсія бабулі* →



*Даходы сям'і*



Правообладатель Национальный институт образования




*Расходы сям'і*

Кожная сям'я лічыць свае **даходы** і **расходы**. Лічыць трэба так, каб грошай хапала на абавязковыя патрэбы. Купіць адразу ўсё, што хочацца, атрымліваецца не заўсёды. Набыццё некаторых тавараў адкладваюць на нейкі тэрмін. Часта на дарагія рэчы грошы збіраюць пакрысе, на працягу некалькіх месяцаў. Добра, калі ў сям'і пасля абавязковых расходаў застаецца частка грошай. Іх адкладваюць на будучыню. **Зберажэнні** расходуюць тады, калі ўзнікае неабходнасць. Напрыклад, на лячэнне, нечаканую паездку і іншае.

Эканоміць грошы ў сям'і могуць і дзеці. Калі берагчы адзенне, абутак, мэблю, кнігі, не давядзецца купляць новыя рэчы. Трэба своечасова закрываць кран з вадой, выключаць святло. Так скароцяцца расходы на ваду і электрычнасць. Неабходна таксама дапамагаць дарослым даглядаць расліны ў агародзе, садзе. Гэта зменшыць расходы на харчаванне. А яшчэ нельга раскідацца грашыма. Не паддавайцеся кожнаму свайму жаданню.



Правообладатель Национальный институт образования

Не патрабуйце, каб вам набывалі тое, чаго раптам захацелася. Напрыклад, надзімаіную цацку, якая хутка лопне. Або машынку, якая хутка надакучыць. Перад тым як нешта купіць, задайце сабе пытанні: ці можна абысціся без гэтага? Ці застануцца потым грошы на самае неабходнае?

1. Падрыхтуйце паведамленне «Як можна сэканоміць». Выкарыстоўвайце апорныя словы.

**Вада, электрычнасць, рэчы, агародніна, садавіна.**

**Берагчы, вырошчваць, выключаць.**

2. Ці давяраюць вам бацькі самастойна купляць што-небудзь у магазіне? Ці ўмееце вы эканомна расходаваць грошы? Як вы разумееце словазлучэнні *раскідацца грашыма, умець лічыць грошы*?

1. Адкуль сям'я атрымлівае даходы? Выкарыстоўвайце малюнак-схему на старонцы 110.

2. На што расходуюцца сямейныя грошы? Выкарыстоўвайце малюнак-схему на старонцы 111.

3*. Якія расходы вы лічыце абавязковымі? Чаму?

4*. Раскажыце, як вы дапамагаеце эканоміць сямейныя грошы.

1. Разам з дарослымі палічыце, колькі грошай расходуе ваша сям'я за месяц.

2. Дапамагайце дарослым весці ўлік паказанняў лічыльнікаў вады і электрычнасці.



Правообладатель Национальный институт образования

## Школьная эканоміка

Што такое школьная эканоміка? Ці можаце вы эканоміць школьныя грошы? Як?

Дзяржаўная школа, даплата.

Школа, як і сям'я, мае сваю гаспадарку, сваю эканоміку. Гаспадарка патрабуе пастаяннай увагі і клопату. Ёю трэба кіраваць.

У нашай краіне большасць дзяцей вучацца ў **дзяржаўных школах**. Навучанне там бясплатнае. Дзяржава выдзяляе школе грошы на тое, каб вучні маглі вучыцца, а настаўнікі — вучыць. За гэтыя грошы ў школу купляюць мэблю, кнігі, абсталяванне для спартзалы, майстэрань. За ацяпленне, ваду, электраэнергію, тэлефон таксама трэба плаціць.

Каб вучні маглі паесці, у кожнай школе працуе сталовая ці буфет. Для прыгатавання абедаў патрэбны прадукты, вада, электрычнасць. Каб прывезці прадукты, неабходны транспарт. Калі скласці ўсе расходы, то атрымаецца вялікая сума. Каб школьны абед не каштаваў надта дорага, дзяржава выдзяляе **даплату**. Значыць, школьнікі аплачваюць толькі частку кошту абедаў.

Нямала грошай ідзе на рамонт памяшканняў, спартыўных пляцовак. Грошы расходуюць на падтрыманне парадку на школьным двары,



Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Серадзінская** Вольга Харытонаўна

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў
з беларускай мовай навучання і выхавання

У дзвюх частках

Частка 2

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *І. М. Дабрыдзень*
Мастакі *К. А. Тукач, М. А. Рацько, В. М. Горбач*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Музычэнка*
Камп'ютарная вёрстка *І. У. Шутко*
Карэктары *Г. М. Мазіна, М. У. Колас, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 01.12.2022. Фармат 70×100/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,72. Ул.-выд. арк. 4,15. Тыраж 575 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск


Правообладатель Национальный институт образования